Понятие «театрализации цирка» рассматривали реформаторы театра: К.С. Станиславский, В.И. Немирович-Данченко. «Театрализация цирка» подразумевала подчинение цирка театральным законам, где в основе циркового представления лежит драматическое произведение. Историки цирка в начале XX века относились скептически к понятию «театрализации цирка», не видели перспектив развития данной формы взаимодействия искусств. Тем не менее, идея «театрализации цирка» находит своё воплощение в понятии «новый цирк», зародившимся в цирковом искусстве Франции в конце 1960-х годов. Особенность «нового цирка» заключается в синтезе классического циркового искусства и драматического театра. Постановки в «новом цирке» представляют собой спектакли, решённые средствами цирковой выразительности. Представления «нового цирка» несут в себе смысл, они направлены не на развлечение, а на обучение, воспитание.

Таким образом, становление и развитие театрального и циркового искусств происходило при постоянном их взаимодействии и взаимовлиянии друг на друга. Этот процесс начинает проявляться особенно активно в эпоху Средневековья, где в театральном фарсе были заложены основы такого циркового жанра, как клоунада. Затем в итальянском народном театре, комедии дель арте, происходит формирование клоунских образов-масок.

В XX веке процесс взаимовлияния и взаимодействия театрального и циркового искусств приводит к формированию понятий «циркизация театра» и «театрализация цирка», под которыми понимается наделение театра элементами цирка, а цирка – элементами театра. В современном художественном процессе все варианты исторического взаимодействия театрального и циркового искусства проявляются в определении «новый цирк», характерными чертами которого стали совмещение в единое целое цирка, театра, клоунады и танца.

**Список литературы:**

1. Макаров, С.М. Театрализация цирка / С.М. Макаров. – М. : Либроком, 2010. – 288 с.
2. Орлова, Т.Д. История театра в вольном изложении / Т.Д. Орлова. – Минск : Медисонт, 2010. – 240 с.
3. Сергеев, А.В. Циркизация театра : от традиционализма к футуризму : учеб. пособие / А.В. Сергеев. – СПб. : Е.С. Алексеева, 2008. – 157 с.

***Юлія Бажок***

## «ХАДЗЬБА» НЯБОЖЧЫКАЎ: ТЫПАВЫЯ І РЭДКІЯ МАТЫВЫ

Вобраз памерлых, якія могуць «прыходзіць», сніцца, шумець ці нейкім чынам уплываць на рэчаіснасць жывых у рознай ступені асветлены беларускімі і замежнымі навукоўцамі [4, с. 258 - 273], [7]. Некаторыя даследчыкі ўказваюць на складанасць у фармаванні дакладных ведаў пра такі персанаж вусных міфалагічных тэкстаў, як «хадзячы нябожчык» [3, с. 30]. Прычыны гэтаму — частковая прысутнасць характэрных для «хадзячых нябожчыкаў» уласцівасцяў у вобразах іншых персанажаў народнай дэманалогіі (чараўнік, хатнік і інш.) і розная тыпы тых, хто вяртаецца (бясшкодныя ці «нядобрыя»).

Мэта нашага артыкула — разгледзець адказы на пытанне «Што рабілі ў даўніну, каб нябожчык не хадзіў?». Для тыпалагізацыі матываў было прааналізавана больш за 600 адказаў на гэтае пытанне з базы Беларускага фальклорна-этналінгвістычнага атласа (далей БФЭЛА)[1, с. 16 – 20]. Адказы запісваліся цягам 30 год (з 1985 па 2013 гг.) у амаль 300 вёсках (больш за 80 раёнаў усіх абласцей) і тэрытарыяльна ахопліваюць усе 6 гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі (Падзвінне, Панямонне, Падняпроўе, Заходняе і Усходняе Палессе, Цэнтральная Беларусь).

Сярод выкарыстаных крыніц і архіваў — архіў Беларускага фальклорна-этналінгвістычнага атласа (БФЭЛА) Цэнтра даследаванняў культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі; асабістыя архівы А.М.Боганевай і Т.Б.Варфаламеевай.

### Тыпавыя матывы-засцярогі ад «прыходу» нябожчыкаў

Мы будзем разглядаць матывы-дзеянні, матывы-рэкамендацыі: ахоўныя ці прэвентыўныя меры засцярогі ад «хаджэння» нябожчыкаў. Прынцыпам, пакладзеным у аснову вылучэння матываў для нашай праблематыкі, з'яўляюццападагульненні тэорый Е.М. Мелецінскага і С.Ю.Няклюдава, сфармуляваныя І.В.Сіланцьевым: «Убачыць семантычную структуру матыва як іерархічную сістэму элементарных, але адначасова глыбінных семантычных сутнасцяў, звязаных логіка-граматычнымі адносінамі наратыва і інварыянтных адносна фабульных варыяцый матыва»[6] і «Не толькі прэдыкат (дзеянне) задае структуру і значэнне аргументаў (г. зн. вызначае семантычныя «ролі»матыва), але, з іншага боку, само значэнне прэдыката шмат у чым вызначаецца ўстойлівымі, характэрнымі аргументамі — суб’ектам (персанажам) і аб’ектам»[6].

Такім чынам, мы вылучалі матывы паводле наступнай схемы: суб’ект (часцей імпліцытны) + дзеянне + аб’ект (ці нават аб’екты). Тыпавыя матывы-засцярогі ад «прыходу» нябожчыкаў:

1) Святар спраўляе службу;
2) Святар адпявае нябожчыка;
3) Сваякі моляцца за нябожчыка;
4) Сваякі абсыпаюць хату ці магілу макам;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5) Сваякі адсякаюць галаву нябожчыка і кладуць паміж яго ног у труне;
6) Сваякі забіваюць драўляны калок у магілу.

Усе пазначаныя матывы рэалізуюцца ў разнастайных варыянтах ці аламатывах [5, с. 183-187]. Разгледзім далей склад дадзеных матываў і аламатываў.

Відавочны тэматычны падзел матываў на рэлігійныя (маліцца, адпяваць, спраўляць службу) і нерэлігійныя (абсыпаць макам, адсякаць галаву, забіваць драўляны калок). Прычым спалучэнне рэлігійных і нерэлігійных матываў у адным адказе сустракаецца даволі рэдка. Напрыклад, з 57 адказаў з матывам «сваякі забіваюць драўляны калок у магілу» толькі ў адным прапануецца яшчэ і «акрапіць магілу асвечанай вадой».

Не ўсе аламатывы адпавядаюць вышэйазначанай схеме: суб'ект + дзеянне + аб'ект. У большасці выпадкаў суб'ект з'яўляецца імпліцытным і толькі зыходзячы з кантэксту можна здагадацца, што дзеянне выконвае святар ці самі сваякі. Частка адказаўне змяшчае адзін з элементаў, на якім трымаецца цэласнасць сэнсу матыва, што выклікае складанасці з далейшым класіфікаваннем. Напрыклад, выпадаюць з разгляду адказы кшталту: «абсыпаць макам». Тут аднаго аб'екта (мак) не хапае для агульнага разумення матыва. Развітым аламатывам у гэтым выпадку будзе, напрыклад, наступны: «абсыпаць асвечаным на Макавея макам-самасеем двор хаты». Разумеем, што суб'ектам дзеяння тут выступаюць самі інфарманты, дзеяннем з'яўляецца працэс абсыпання, аб'ектам «*што*» выступае мак (прычым указваецца дзе ён узяты і калі павінен быць асвечаны), а аб'ектам «*дзе*» з'яўляецца двор хаты. Аламатыў развіты настолькі, што з'яўляецца яшчэ адзін імпліцытны суб'ект — святар, які ў пэўны час гэты самы мак і асвяціў.

Падобная сітуацыя і з астатнімі тыпавымі матывамі-засцярогамі ад «прыходу» нябожчыкаў. Параўнаем аламатывы да матыва «сваякі забіваюць драўляны калок у магілу», вылучаныя з розных адказаў:

1. забіць кол;
2. забіць асінавы кол;
3. забіць асінавы кол у магілу;
4. забіць асінавы кол у магілу ў раёне галавы;
5. забіць асінавы кол у магілу ў раёне грудзіны наскрозь да зямлі.

**Рэдкія матывы-засцярогі ад «прыходу» нябожчыкаў**

Рэдкімі, вылучанымі з прааналізаваных адказаў, з'яўляюцца наступныя матывы (кожны з іх сустракаецца ў адказах толькі па два разы):

1. Сваякі накрываюць ці перагортваюць люстэркі;
2. Сваякі кідаюць услед за трунай яловыя галінкі;
3. Сваякі звяртаюцца да шаптухі ці шаптуна.

Колькасць рэдкіх матываў значна большая, але нават пералічаныя вышэй могуць даць агульнае ўяўленне пра разнастайнасць засцерагальных дзеянняў ад «хадзячых нябожчыкаў».

Цікава, што некаторыя з гэтых матываў часам супрацьпастаўляюцца ў адказах, дзе інфармант тлумачыць значэнне рэкамендацыі. Напрыклад, адказ «Сваякі кідаюць услед за трунай яловыя галінкі» сустракаецца чатыры разы, але тлумачыцца інфармантамі па-рознаму: два адказы ўказваюць на засцярогу ад «хадзьбы»нябожчыка, а іншыя два — наадварот указваюць нібы на зацікаўленасць «вярнуць» памерлага.

Таксама ўнікальным з'яўляецца выпадак звароту да калдуна ці шаптухі з мэтай засцерагчыся ад «хадзячага нябожчыка». Гэты матыў з'яўляецца асаблівым, бо ў многіх іншых адказах сярод тых памерлых, якія могуць «вяртацца», нярэдка ўказваюцца «калдуны» ці «чараўнікі».

Такім чынам, вышэйапісаныя матывы і аламатывы, вылучаныя з адказаў на пытанне:«Што рабілі ў даўніну, каб нябожчык не хадзіў?», — і кароткае іх апісанне — папярэдні падступ да тэмы «Хадзячыя нябожчыкі». У далейшым праанализаваныя матывы будуць картаграфаваныя. А некаторыя рэдкія матывы вымагаюць заняцца глыбейшым іх супастаўленнем і, магчыма, правесці новыя палявыя даследаванні.

**Архівы:**

БФЭЛА — электронны архіў Беларускага фальклорна-этналінгвістычнага атласу сектара этналінгвістыкі і фальклору Цэнтра даследаванняў культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

**Спіс літаратуры:**


1. Антропов, Н. П. Белорусский этнолингвистический атлас: история, архив, результаты и перспективы // Живая старина—2010. — № 4. С. 16 – 20.
2. Виноградова, Л. Н. Полесская народная демонология на фоне восточнославянских данных // Восточнославянский этнолингвистический сборник: исследования и материалы —М.: «Индрик», 2001. — С. 10 – 49.
3. Конобродська, В. Л. Поліський поховальний і поминальні обряди. — Т. 1. — Етнолінгвістичні студії. — Житомир, «Полісся», 2007. — 356 с.
4. Путилов, Б. Н. Фольклор и народная культура; Inmemoriam. —СПб.: Петербургское востоковедение, 2003. — 464 с. (EthnographicaPetropolitana, IX).
5. Силантьев И. В. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: Теория мотивав отечественном литературоведении и фольклористике. Очерк историографии. http://www.ruthenia.ru/folklore/silantiev1.htm Дата доступу: 05.08.2014.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Симонсуури Лаури [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: Указатель типов и мотивов финских мифологических рассказов. http://www.ruthenia.ru/folklore/simonsuuri.htmДата доступу: 26.03.2015.

*Кацярына Блоцкая*

## КУПАЛЬСКІ АБРАДАВЫ КОМПЛЕКС БЕЛАРУСАЎ

Беларускае Купалле − адзін з найбольш складаных рытуальных комплексаў, які ўключае ў сябе звычаі і абрады, вераванні і прыкметы, магічныя прыёмы, гульні, танцы, якія суправаджаліся выкананнем спецыяльных абрадавых песень [9, с. 52]. У параўнанні з іншымі славянскімі народамі, беларускі купальскі абрад характарызуецца значнай лакальнай разнастайнасцю, а само свята захавала больш архаічных элементаў. Купальскае свята складалася з шэрагу абрадавых дзеянняў, якія ўключаліся як у падрыхтоўчы этап свята, так і ў сам яго ход. Да падрыхтоўчага этапу свята ў купальскім абрадавым комплексе беларусаў можна аднесці наступныя дзеянні: 1) збор купальскіх траў і зёлак, нарыхтоўка старых рэчаў для спальвання на купальскім вогнішчы, выраб купальскага пудзіла. 2) Абарона ад нячыстай сілы (праворванне сахой зямлі вакол вёскі, абкурванне і ўпрыгожванне купальскімі зёлкамі і раслінамі жылых і гаспадарчых пабудоў). 3) Вячэрні абыход вёскі з мэтай збору ўсіх удзельнікаў Купалля і агульнае шэсце да асноўнага месца правядзення свята.

Сам абрад складаўся з наступных абрадавых дзеянняў: 1) распальваньне купальскага вогнішча (раней – здабыванне жывога агню). 2) Спальванне старых рэчаў і лялькі-ведзьмы («Марэны»). 3) Ігрышчы-варожбы каля вогнішча і на вадзе (у т. л. з вянкамі). 4) Пошукі «папараць-кветкі». 5) Свавольства моладзі (гульні, жарты над вяскоўцамі, ...). 6) Рытуальнае купанне ў вадаёмах. 7) Назіранне за гульнёй сонца [9, с. 13, 41]; [1, с. 167-169]; [3, с. 213]; [6, с. 209]; [5, с. 48]; [4, с. 32].

Беларусы лічылі Купалле часам актывізацыі нячыстай сілы. Верылі, што ў купальскую ноч ведзьмы і ведзьмакі маглі ператварацца ў розных жывёл (катоў, жаб, чарапах, змей і інш.), наносіць шкоду свойскай жывёле, ураджаю, людзям. Таму перад святам і падчас самога свята на тэрыторыі Беларусі было зафіксавана мноства абарончых дзеянняў ад нячыстай сілы і вялікая колькасць спосабаў барацьбы з ёй: у дзверы затыкалі крапіву, жыллё пасыпалі свянчоным макам, абаранялі гаспадарчыя і жылыя пабудовы з дапамогай сярпоў, кос і віл. Для выратавання ўраджаю ад ведзьмаў кідалі ў жыта галавешкі з купальскага вогнішча, ўтыкалі па перыметры поля асінавыя галінкі, палілі вогнішчы і стараліся шумець, стукаць і крычаць. [15, с. 240-242]; [7, с. 67-68]; [13, с. 64-65].

Надзейным абарончым сродкам таксама лічыліся зафіксаваныя на тэрыторыі Беларусі спецыяльныя купальскія песні-абярэгі. Такія песні насілі характар замоў, мелі напружанае і рэзкае гучанне і выконваліся з асаблівай эмацыянальнай аддачай:

«Ой, на Купаллі цёмныя ночы, ой выбер Божа ведзьміны Вочы! / Ой выберы Божа ведзьміны вочы, каб не хадзіла ў цёмныя ночы!»

Песні суправаджалі кожнае абрадавае дзеянне Купалля. Акрамя песень-абярэгаў выконваліся таксама лірычныя песні (напрыклад, падчас пляцення вянкоў):

«Пайдзём, дзевачкі на лужкі гуляць / На лужкі гуляць вянкі завіваць.»

У агні купальскага вогнішча нашы продкі спальвалі загадзя прыгатаваныя саламяныя лялькі, што можна трактаваць як ахвярапрынашэнне або прыём сімвалічнай магіі. Замест саламянай лялькі ў купальскіх абрадах маглі выкарыстоўвацца чарапы жывёл або іх косці. [13, с.13]; [2, с. 499-500]; [9, с. 53]; [15, с. 239]; [13, с. 13]. Каля купальскага вогнішча ладзілі абрадавую вячэру. Звычайна елі варэнікі, яешню, кулагу [15, с. 240]; [1, с. 267]; [7, с. 68].

Галоўная рыса купальскіх агнёў − іх грамадскі характар. Непрыняцце ўдзелу ў купальскім абрадзе лічылася недапушчальным і прыраўноўвалася да сувязі адсутных з нячыстай сілай: «Наталка на Купаллі не была / То-то ведзьма была / Да Кіёва летала на Йвана... ».

У шэрагу рытуальна-магічных акцый Купалля прасочваецца падабенства ў абрадавых практыках розных народаў. Этнакультурныя асаблівасць беларускага Купалля характарызуецца шырокім арэалам распаўсюджання купальскіх абрадаў, што практычна супадае з межамі рассялення беларускага этнасу. Гэта з'явілася адной з прычын захавання ў аўтэнтычнай форме шэрагу элементаў, якія вызначаюць фальклорна-этнаграфічны комплекс беларускага Купалля ў сістэме абрадавых практык еўрапейскіх народаў.

### Спіс літаратуры:

1. Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўнік / рэд. С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2004. – 591 с.
2. Беларусы : у 8 т. / рэдкал. В.М. Бялявіна [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2002–2004. – Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В.Ф. Бацяеў, А.У. Гурко [і інш.]. – 2002. – 605 с.
3. Боганева, А.М. Міфалагічныя персанажы і міфалагічныя наратывы Брэсцкага Палесся ў пачатку XXI стагоддзя / А.М. Боганева // Палявая фалькларыстыка і этналогія: даследаванне лакальных культур Беларусі [зб.] / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; уклад. І.Ю. Смірновай, навук. рэд. В.А. Лабачэўская. – Мінск, 2008. – С. 61–68.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ